ГАЗЕТА З БЕЛАРУСІ

ГОЛАС РАДЗІМЫ

ВЫДАЕЦЦА З 1955 ГОДА ● № 01 (3589) ● ПАНЯДЗЕЛАК, 14 СТУДЗЕНЯ, 2019

ВЫДАННЕ «ГОЛАС РАДЗІМЫ» ЧЫТАЙЦЕ НА ПАРТАЛЕ ZVIAZDA.BY

Лён кладзецца ў лёсу палатно
Стар. 5

Да Паэта — з чырвонымі ружамі
Стар. 7

Іван ды Марыя з Азершчыны
Стар. 8

РАЗАМ

Падарунак пад Новы год

На Галоўнай ёлцы Беларусі ў Палацы Рэспублікі пабывалі сярод іншых і выхаванкі Беларускай нядзельнай школы “Вясёлка”

БЕЛТА

Аляксандр Лукашэнка з дзецьмі на свяце

Спяшаемся падзяліцца радаснай навіною: перад Новым годам у нас былі хвалюючыя сустрэчы, новыя знаёмствы на беларускай зямлі. Калі 27 снежня ў Мінску ладзілася навагодняе свята для дзяцей у плыні дабрачыннай акцыі “Нашы дзеці” з удзелам Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі, то запрошаны былі на яго сярод іншых і выхаванкі беларускай нядзельнай школы “Вясёлка” нашага Даўгаўпілскага беларускага культурна-асветніцкага таварыства “Уздым”.

Як вядома, у навагоднюю пару здараюцца розныя цуды. У тым пераканаліся й чатыры дзяўчынкі з Даўгаўпілса ды іх бацькі. Гэта здорава, што ў Беларусі памятаюць супляменнікаў з замежжа, што на дзяржаўным узроўні падтрымліваюцца з намі сувязі. Вось і запрасілі нас, як беларусаў замежжа, у Мінск: на галоўную ёлку краіны. Перадднавагодняя паездка стала магчымай дзякуючы Амбасадзе Беларусі ў Латвіі, з якой у нас даўно складваецца плённае супрацоўніцтва.

Школьніцы, іх бацькі ўбачылі, як запальваюцца агні на Галоўнай ёлцы Беларусі, прагуляліся па сталіцы, якая зіхацела ў навагодняй ілюмінацыі. Але ў асноўную падзею захапляльнай паездкі акунуліся мы раніцай 27 снежня, у Палацы Рэспублікі. Якраз там праходзіла навагодняе свята з удзелам Прэзідэнта ў плыні Усебеларускай дабрачыннай акцыі “Нашы дзеці”. На яго запрасілі больш за 2300 дзяцей з усіх рэгіёнаў Беларусі: дзяцей-сірот, дзяцей з сем’яў бежанцаў, выхаванцаў кадэцкіх вучылішчаў, пераможцаў алімпіяд, творчых конкурсаў і фестываляў, спартыўных спаборніцтваў, юных грамадскіх актывістаў. Для іх падрыхтавалі насычаную культурную праграму. Спачатку дзеці гулялі, весяліліся ля ёлкі разам з пацешнымі мульцяшнымі героямі. Яны ж забаўлялі дзятву і ў канцэртнай зале перад пачаткам імпрэзы. Пад апладысменты на сцэну выйшаў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка. У сваёй цёплай прамове кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што дзеці — гэта галоўны набытак нашай Беларусі. Прычым гэта, прадоўжыў ён, не проста прыгожыя словы, за імі — шчырая любоў, а таксама жаданне дарослых клапаціцца пра дзяцей, абараняць іх. ➔ Стар. 3

СВЯТЫНІ

Пакланенне Радзіме

МАСТАК АЛЕГ КАРПОВІЧ

З чаго яна складаецца,
Радзіма?
Шукае кожны
ў сэрцы
свой адказ,
Бо жыць нам
без Радзімы —
немагчыма...
З Калядамі,
Раством
і Новым годам вас!

Іван Ждановіч

Крыж і крылы Уладзіміра Банцэвіча

год малой радзімы

На пачатку года, 2 студзеня, 70-гадовы юбілей адзначыў вядомы мастак, педагог, кіраўнік Саюза беларусаў Дону, які родам з Палесся

Іван Ждановіч

Віншуем Уладзіміра Мікалаевіча! Дзякуем яму за плённую супрацу з нашай газетай, за многія добрыя справы, што робіце з аднадумцамі ў імя Бацькаўшчыны, пашыраючы на растоўскай зямлі беларускую культуру. І ў тым шэрагу найбольш маштабны праект, як нам падаецца, — гэта Музей расійска-беларускіх этнакультурных традыцый “Избахата-курень”, створаны па ініцыятыве й сіламі актывістаў Саюза беларусаў Дону ў 112-й школе Растова-на-Доне. Яшчэ адзін каштоўны набытак мастака — створаны ім у 2007 годзе на базе ўласнай творчай майстэрні гурток юнага іканапісца з беларускай назвай “Абразок”.

Летась Уладзімір Банцэвіч дасылаў нам у рэдакцыю свае нарысы-абразкі, тлумачыў: “Трэба ж трохі адчытацца перад Бацькаўшчынай, чым я ўдалечыні ад яе займаюся. А як жа: на носе ўжо, як кажуць, і 70-гадовы юбілей... Я стараўся, як мог, увасобіць у карціне ўласнага жыцця тыя каштоўныя ўрокі, якія атрымаў калісьці ад сваіх беларускіх настаўнікаў — наш выпуск быў у далёкім 1966-м, у Гоцкай сярэдняй школе Салігорскага раёна. Між тым і пасляваеннае дзяцінства навучыла мяне выжываць, знаходзіць выйсце ў самых цяжкіх сітуацыях — а не ныць, не скардзіцца на тыя цяжкасці. Дарэчы, бацька ж мой быў кадравым афіцэрам, але гэта бацька — не з Гоцка, там у мяне ўжо вотчым быў: Ермаковіч Павел Іванавіч. З ім, калі па шчырасці, усялякае бывала, але ж я цяпер яму за многае і ўдзячны. І дзед мой быў кадравым афіцэрам, ён — беларус з вёскі Камень, што пад Пінскам, дзе я і нарадзіўся”.

Нам і чытачам газеты помняцца экспедыцыі-2018 Уладзіміра Банцэвіча ў Беларусь. Першая — зімовая (“Экспедыцыя на Бацькаўшчыну”, 14.03.2018), з адметным падзагалоўкам: “Нататкі пра тое, дзеля чаго вандроўнікі з Дона праехалі па зімовых дарогах Расіі ды Беларусі звыш чатырох з паловай тысяч кіламетраў”. І тое было ўжо адно з першых “святочных мерапрыемстваў” да знакавай даты. А ўлетку была й другая дзея: пленэрная гістарычна-патрыятычная экспедыцыя “Свяшчэнныя палі Расіі ды Беларусі ў малюнках дзяцей”. Уладзімір Мікалаевіч ладзіў яе з юнымі мастакамі новаствораннага ім жа Растоўскага-на-Доне творчага аб’яднання “Нашчадкі. XII — XXI стагоддзе” імя

Дыплом за літаратурную творчасць

асветніка Кірылы Тураўскага. (Больш пра экспедыцыю — у нататках Уладзіміра Банцэвіча “Жывапіс белых дарог”, што друкаваліся летась у двух нумарах газеты: 31 ліпеня і 16 жніўня).

Як мне падаецца, вялікая грамадская праца Уладзіміра Банцэвіча ў сілавым полі беларускай культуры — гэта, вобразна кажучы, і крыж ягоны (бо дзейнасць такая патрабуе вялікіх намаганняў), і крылы (бо шмат узнёслых, радасных хвілін перажывае душа творцы ў высокай паяднанасці з Зямлёю Продкаў). І цяпер, ведаю, ва Уладзіміра Мікалаевіча шмат клопатаў, прычым не толькі святочных. У адказ на рэдакцыйнае віншаванне “Хай збываюцца Вашы найлепшыя мары — і раскрываюць свае цёплыя абдымкі лепшыя небасхілы новага дзесяцігоддзя!” ён з удзячнасцю напісаў: “Самае цудоўнае пажаданне новага дзесяцігоддзя, бо — амаль стагоддзя: цяпер я жыву як год за дзесяць. Трэба паспець не толькі малюнкі зрабіць, але ж і дзве кнігі падрыхтаваць: у працы беларускі зборнік “Мая Прыпяць” і фантастыка для дзяцей “Погружение в бездну будущего”.

А перад Новым годам зямляк падзяліўся з намі прыемнай навіною: што стаў адным з пераможцаў конкурсу “Российская литературная премия-2018” у намінацыі “Малая проза”. Пра тое сведчыць дыплом 3-й ступені, медаль “За заслуги в области культуры и искусства” — яны дасланы з рэдакцыі літаратурнага часопіса “Российский колокол”. Па гэтай узнагародзе, патлумачыў творца, яго прымаюць у Інтэрнацыянальны Саюз пісьменнікаў.

Некаторыя з беларускіх па тэматыцы тэкстаў, што рыхтуе Уладзімір Банцэвіч для будучых кніг, прапануем вашай увазе. ➔ Стар. 6

ISSN 0439-3619
9 770439 361003 19001

СВЕТАПОГЛЯД

Балі вяртаюцца

Навагодні баль для моладзі прайшоў у мінскім Палацы Незалежнасці

БЕЛТА

На балі ў Палацы Незалежнасці разам з моладдзю танцуюць і першыя асобы дзяржавы

Раней пра балі мы ведалі хіба з мемуараў пра дарэвалюцыйнае жыццё асоб з вышэйшага свету, з класікі накшталт "Вайны і міру" Льва Талстога ці пушкінскага "Яўгенія Анегіна". Яшчэ — з казак ды фільмаў: памятаю "Папялушку", якую мы, вяскоўцы, глядзелі па чорна-белым тэлевізары ў невялічкай каморцы былога панскаго дома, дзе пасля вайны знайшла сабе прытулак шматдзетная сям'я калгаснікаў.

І вось жа: 100 гадоў БССР адзначаем — ды зноў вяртаемся ў чараўніцтва сапраўднага балю: з прыгожай жывой, "іскрыстай", нібы шампанскае, аркестровай музыкай (не дыскатэка ж!), класічнымі танцамі, непаўторнымі ўборамі дзяўчат і жанчын, строгімі касцюмамі мужчын, вытанчанымі манерамі... Праходзіў баль для моладзі у пераднавагоднія дні ў знакавым месцы. Студэнты й старшакласнікі, якіх запрасілі на імпрэзу, казалі: тут кожны нечага варты, праявіў сябе, дасягнуў поспехаў у навучанні, творчасці, спорце. Аляксандр Лукашэнка, вітаючы ўдзельнікаў балю, падкрэсліў: "Шчаслівы бачыць вас тут — такіх маладых, натхнёных, вельмі прыгожых. Дзякуючы вам гэтая заўсёды строгая зала Палаца Незалежнасці сёння становіцца неафіцыйнай, такой прыгожай і ўрачыстай".

Хоць такі навагодні баль у класічным, як кажуць, фармаце праходзіў у Палацы Незалежнасці ўпершыню, ды "шлях" да яго ўжо быў адкрыты ў Беларусі XXI стагоддзя. Давялося й мне аднойчы пабываць, напрыклад, на Вялікім навагоднім балі: ён ладзіцца ў Вялікім тэатры ў ноч з 13 на 14 студзеня. Ці, як кажуць на постсавецкай прасторы, у Стары Новы год. І сёлета такі баль, што карыстаецца вялікай папулярнасцю, прайшоў — ужо ў дзясяты раз.

Не сакрэт: культурны код многіх народаў мае ў патаемных сховах танцы. Як у вышэйшым свеце, так і на вясковых вячорках таленавітыя танцоры мелі аўтарытэт. Бо праз танец, як вядома, добра бачна сутнасць чалавека. Цяпер жа ў вялікай цане — гарманічнае развіццё: высокі ўзровень культуры, павага да традыцый, уменне валодаць як думкай, словам, рукамі, эмоцыямі, так і — нагамі... Дарэчы, беларусы Іркуцка, напрыклад, з вядомым танцорам-энтузіястам Алегам Рудаковым ужо даўно выкарыстоўваюць народныя танцы як сродак гарманічнага адпачынку, далучэння прадстаўнікоў іншых народаў да багатай беларускай культуры. Там ніводнае свята без народных танцаў не абыходзіцца! І ўжо й ніхто не сумняваецца, наколькі карысныя танцы — ва ўсіх сэнсах. Гэта калі ведаць у іх меру... І, безумоўна, ведаць, што паміж танцамі на класічным балі й на сучаснай дыскатэцы ёсць вялікая розніца. Зрэшты, уся культура — гэта тонкія нюансы. А вяртанне маладзёжнага пераднавагодняга балю ў грамадскае жыццё Беларусі можна расцаніць як важны крок у будучыню.

Ніколі раней не бачылі мы, як танцуюць разам з моладдзю першыя асобы нашай дзяржавы. Скажам, Аляксандр Лукашэнка, павіншаваўшы дзяўчат і юнакоў з навагоднімі святамі, вальсаваў разам з Міс Беларусь-2018, Міс Еўропа-2018 Марыяй Васілевіч пад акампанемент Прэзідэнцкага аркестра. Побач танцавалі ў парах Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля Качанава, Прэм'ер-міністр Сяргей Румас... Мяркую, у Новым годзе танцы будуць у модзе. Аднак жа ў народзе кажуць: як папрацуеш — так і патанцуеш. Перакладаючы на сучасную мову: хто з хлопцаў і дзяўчат жадае патрапіць у будучыні на такі прэстыжны баль — таму трэба ўжо сёння брацца за працу.

Іван Ждановіч

СУПОЛЬНАСЦЬ

"Казачок" у Калодзішчах

Прыгожае свята пад назвай "Украінскія вячоркі" правялі ў мінскім прыгарадзе сябры суполкі "Обрій"

Пасёлак Калодзішчы — побач з Мінскам, там жывуць прадстаўнікі розных нацыянальнасцяў. Якраз у гэтым прыгарадзе ў 1992 годзе ўкраінцы стварылі Культурна-асветнае таварыства "Обрій" ("Далягляд"). Пазней, дарэчы, па ініцыятыве "Обрія" і ў шэрагу іншых месцаў Беларусі ўтварыліся суполкі ўкраінцаў. А ў Калодзішчах часта ладзяць вечарыны, творчыя імпрэзы нашы сябры-ўкраінцы, якія стала жывуць у Беларусі. Я быў там на вечарыне, прысвечанай Кабзару — Тарасу Шаўчэнку, і ў 2016-м годзе пісаў у "Голасе Радзімы" пра тую падзею.

А нядаўна, у снежні, у пасялковым Доме культуры, дзе кіраўніком ініцыятыўная Вольга Жылко, зладзілі светлае, прыгожае свята "Украінскія вячоркі". Ва ўтульнай зале, упрыгожанай украінскімі ручнікамі, фотаздымкамі мастацкіх калектываў, сабралася шмат гледачоў: як з Калодзішчаў, так і з іншых гарадоў краіны. І пакуль доўжыўся, больш чым дзве гадзіны, канцэрт, у зале панавала атмасфера сардэчнай радасці, амаль сямейнага свята. Праграму ж вяла кіраўніца "Обрія" Таццяна Бей. Перад кожным нумарам распавядала пра святы й прысвяткі снежня месяца ды як іх святкуюць на Украіне. У канцэрце ж паўдзельнічалі народны калектыў Музычнага тэатра "Надія" (кіраўнік І. Несцярчук), гурты "Вольніца", "Пісочніца" ды іншыя. З вялікім майстэрствам украінскія народныя песні выконвалі салісты Раман Рафеенка, Ліза Рэут, Ліля Грышчанка. Весяліў гледачоў сваімі байкамі Аляксандр Глушкоў. З вялікім замілаваннем сустрэлі гледачы выступленне дзіцячага харэаграфічнага гурта "Пісочніца", які выканаў іскрамётны танец "Букавінскія каламыйкі". А калі Марыя Рудык і Ала Шэко спявалі "Рэквіем", прысвечаны загінулым героям Украіны, то ўсе ў зале слухалі песню стоячы.

Напрыканцы канцэрта быў майстар-клас: артысты ансамбля "Вольніца" дапамагалі гледачам асвоіць асноўныя

Выступаюць артысты музычнага тэатра "Надія"

элементы знакамітага ўкраінскага танца "Казачок". Да тых, хто навучаўся майстэрству, далучыліся Першы сакратар Амбасады Украіны ў Беларусі Іван Башняк з унучкай. Дыпламат пазней уручыў граматы-падзякі ад Амбасады Украіны кіраўніцы "Обрія" Таццяне Бей, народнаму калектыву Музычнага тэатра "Надія", гурту "Пісочніца", а таксама Ліліі Грышчанцы й Лізе Рэут.

На "Украінскіх вячорках" яшчэ казалі: беларускіх украінцаў ведаюць і ў замежжы не толькі дзякуючы песням ды танцам, з якімі выступалі яны ў многіх гарадах Беларусі, у Чэхіі, Балгарыі, Славакіі ды іншых краінах Еўропы. Таццяна Бей нагадала, што сябры суполкі "Обрій" на тэрыторыі Беларусі высадзілі больш за 4 тысячы саджанцаў дуба, якія ўтвараюць сёння так званыя "Шаўчэнкаўскія гаі". Вось так, у прыгожых і карысных справах мацнее дружба паміж украінскім і беларускім народамі. Прычым і рэсурс "народнай дыпламатыі" ў гэтым сяброўстве — найкаштоўны. Акрамя "Обрія", вызначаюцца ў Беларусі грамадскай актыўнасцю суполкі ўкраінцаў "Трэмбіта", "Берегіня", "Барвінок" ды іншыя.

Лявон Целеш

СА СТУЖКІ НАВІН

Мы ўзвялі гэты храм

У Беларусі, як вядома, жывуць прадстаўнікі розных плыняў хрысціянства, таму й два святочныя дні ў дзяржаўным календары ёсць у Калядную пару: Раство Хрыстова мы святкуем як 25 снежня, так і 7 студзеня. Традыцыйна раніцай 7 студзеня, калі ладзяцца святочныя набажэнствы ў праваслаўных храмах, да вернікаў далучаецца Аляксандр Лукашэнка. На гэты раз ён быў у нядаўна асвечаным Храме-помніку ў гонар Усіх Святых. Там кіраўніка дзяржавы віталі Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі, Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел, настаяцель прыхода Усіх Святых протаіерэй Фёдар Поўны, Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Леанід Гуляка, сталічны мэр Анатоль Сівак.

У звароце да вернікаў Прэзідэнт падкрэсліў, што свята Божага Нараджэння для нашага народа — больш чым хрысціянская традыцыя: бо яно яднае людзей незалежна ад ступені духоўнасці й сілы веры. Закранае ў сэрцах глыбінныя пачуцці: жаданне любіць, дараваць, жыць у міры й згодзе. Пры тым кіраўнік дзяржавы адзначыў, што Раство Хрыстова — адно з найглыбокіх па сваім сэнсе хрысціянскіх святаў. Яно сімвалізуе нараджэнне чалавека, якому наканавана здзейсніць подзвіг, ахвяраваць сабою дзеля выратавання лю-

На святочным набажэнстве ў храме

дзей. Таму асаблівае значэнне гэтае свята мае для беларускай зямлі: яна страціла мільёны сыноў і дачок, якія цаной сваіх жыццяў абаранялі Айчыну пад час войнаў. "Лёсы многіх бясследна сцёр час. Але імёны герояў мінулага стагоддзя й нашых дзён мы ўвекавечылі, пабудаваўшы гэты велічны Храм-помнік. Усё ў гэтым праекце, ад ідэі да ўвасаблення задумы, служыць галоўнай мэце: захаванню гістарычнай памяці, сцвярджэнню міру і згоды ў грамадстве", — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што беларусы — горды, незалежны, талерантны і вельмі добры народ, які заўсёды добра ставіцца да ўсіх сваіх суседзяў, у тым ліку расіян і ўкраінцаў.

Тое, што ўзвышае

Аляксандр Лукашэнка ў чарговы раз прысудзіў штогадовыя прэміі "За духоўнае адраджэнне" і спецпрэміі дзеячам культуры й мастацтва. Па выніках 2018 года прысуджаны 4 прэміі "За духоўнае адраджэнне". Імі адзначаны працоўныя калектывы, прадстаўнікі рэлігійных аб'яднанняў за актыўную дзейнасць у гуманітарнай сферы.

Шэраг калектываў, творчых асоб адначаны спецыяльнымі прэміямі (іх было 9) дзеячам культуры й мастацтва. На ўрачыстай цырымоніі ўзнагароджання, што прайшла ў Палацы Рэспублікі, ушанаваныя таксама тры лаўрэаты прэміі "Беларускі спартыўны Алімп".

Вольга Мазуронак — у ліку лаўрэатаў

Нам прыемна, што ў спісе лаўрэатаў спецпрэміі Прэзідэнта дзеячам культуры й мастацтва сёлета — і творчы калектыў былых малалетніх вязняў фашызму "Судьбы", пра які мы не раз пісалі. Калектыў адзначаны за значныя дасягненні ў справе захавання памяці пра Вялікую Айчынную вайну, патрыятычнае выхаванне моладзі, дастойнае прадстаўленне Беларусі пад час акцыі "Не фашызму! Дзяцінства без вайны!"

Падрыхтаваў Іван Ждановіч — паводле матэрыялаў БелТА

РАЗАМ

Падарунак пад Новы год

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)

Аляксандр Лукашэнка разам з дзецьмі глядзеў маляўнічае музычна-сцэнічнае шоу — на сцэне працавалі лепшыя творчыя калектывы Беларусі. Юныя гледачы, затаіўшы дыханне, суперажывалі дзяўчынцы й яе хворай маме, ганарыліся іх неабыякавымі сябрамі, назіралі, як энергічна светлыя сілы змагаюцца з ліхімі — а ўрэшце вывелі Формулу Дабрыні. Казачны мюзікл суправаджаўся эфектнымі сюррэалістычнымі кадрамі на трох вялікіх экранах. У фінале Дзед Мароз і Снягурка віншавалі дзяцей з Новым годам.

Пакідаючы Палац Рэспублікі, удзельнікі свята павезлі з сабой незабыўныя ўражанні, падарункі ад імя Прэзідэнта Беларусі. Дарэчы, у навагодні падарункавы камплект, прысвечаны Году малой радзімы, увайшлі паштоўка-віншаванне з календаром, вялікая скрынка беларускіх цукерак, штодзённік школьніка і заплечнік з лісянём Лесікам — талісманам II Еўрапейскіх гульняў, якія ўлетку будзе прымаць Беларусь.

Усю дарогу дадому юныя даўгаўпілчане — Лайма і Лаліта Казлоўскія, Элеанора Марчанка і Сафія Блізнакова — расказвалі пра найяркія моманты, што іх уразілі, запомніліся. “Гэта проста навагодні цуд, неверагодны падарунак, яго нашы дзеці запомняць на ўсё жыццё!” — не ўтойвалі сваіх эмоцый таксама й бацькі выхаванак Беларускай нядзельнай школы “Вясёлка”.

Удзельнікі дэлегацыі выказваюць шчырую падзяку за магчымасць наведаць Мінск і Галоўную ёлку Беларусі — Амбасадзе Беларусі ў Латвіі, за візавую падтрымку — Генконсульству Беларусі ў Даўгаўпілсе, за высокі ўзровень прыёму — Кастрычніцкаму раёну Мінгарвыканкама, за арганізацыю паездкі — праўленню суполкі “Уздым”.

Дарэчы, беларусы Даўгаўпілса таксама далучаны ў плынь дабрачынных акцый, якімі ў Навагодне-Калядную пару поўніцца наша Бацькаўшчына. Напярэдадні Каляд, 24 снежня, моладзь Беларускага культурна-асветніцкага таварыства “Уздым” наведала выхаванцаў мясцовага дзіцячага дома-прытулку “Прыедытэ” — з падарункамі, канцэртам. Увогуле мы паслядоўна рэалізуем праграму дабрачынных акцый. А тут моладзь суполкі выступіла з ініцыятывай: падарыць свята тым, хто сустракае яго не дома з бацькамі, а ў дзіцячым прытулку. Валанцёры сабралі “Скрынку радасці” — кнігі, размалёўкі, гульні, канцтавары, прысмакі. Марозным ранкам паехалі ў Стропы: там дзіцячы дом — у сасновым бары, побач з возерам. Дабрадзеяў чакалі: дзеці з цікавасцю сустрэлі Вядучую і Фей, уважліва слухалі паэта Станіслава Валодзьку, песні пад гітару, актыўна ўдзельнічалі ў гульнях, чыталі вершы для Дзеда Мароза й Снягуркі, радаваліся падарункам. “Наша ўвага — найвялікі падарунак, які мы змаглі зрабіць дзецям. Спадзяемся, што дзякуючы такім добрым прыкладам яны будуць верыць у людскую дабрыню”, — адзначыла сябар праўлення суполкі “Уздым” Марыта Кавалеўская. І мы ўдзячны ўсім сябрам суполкі, якія паўдзельнічалі ў Каляднай дабрачыннай акцыі.

Жанна Раманоўская,
старшыня таварыства
“Уздым”, г Даўгаўпілс
Фота аўтаркі.

БЕЛТА

Школьніцы Даўгаўпілса на Прэзідэнцкай ёлцы

Ад рэдакцыі. Як паведаміла на прэс-канферэнцыі ў Мінску супрацоўніца Міністэрства адукацыі Алена Сімакова, у ліку іншых на Галоўную ёлку краіны былі запрошаны й дзеці, што навучаюцца ў Вільнюскай беларускай гімназіі імя Францішка Скарыны і Рыжскай асноўнай беларускай школе імя Янкі Купалы. Ці сустракаліся з імі дзеці з Даўгаўпілса? “З намі была дэлегацыя з Рыгі: 22 школьнікі плюс 2 настаўніцы, — удакладніла Жанна Раманоўская. — А з вільнюскай дэлегацыяй не сустрэліся. Наша нядзельная школка ліцэнзаваная з праграмай — як гурток па інтарэсах, а не па навучальнай праграме як “сапраўдныя” школы. Але ж дзякуючы Амбасадзе нас дадалі да большай дэлегацыі Рыжскай школы. У наступным годзе, спадзяемся, будуць і месцы ўжо менавіта для дзяцей нашай школкі”. Спадарыня Жанна пахвалілася, што ў Мінску беларусы-даўгаўпілсцы купілі прыгожыя футравыя строі Дзеду Марозу й Снягурцы (Жлобінскай фабрыкі), таму і ў таварыстве, і ў нядзельнай школцы на Калядах былі яны ў новым убранні. “Цудоўнейшыя беларускія вырабы!” — не хавае эмоцый зямлячка.

Нагадаем: Усебеларуская дабрачынная акцыя “Нашы дзеці” праходзіла з 10 снежня па 11 студзеня. Пад час яе штогод адказныя службовыя асобы, кіраўнікі арганізацый і прадпрыемстваў, парламентарыі, бізнесмены наведваюць дамы-інтэрнаты, педцэнтры, установы адукацыі. Асаблівая ўвага надаецца дзецям з дзіцячых дамоў. Прычым, адзначала Алена Сімакова, у многіх установ, дзе выхоўваюцца дзеці-сіроты, дзеці-інваліды, ужо ёсць трывалыя шэфскія стасункі.

Вельмі прыемна, што Эстафету Дабрачыннасці падхапілі й беларусы замежжа. Бо калі ў свеце беларусаў будуць ведаць як людзей добрых, спагадлівых, міласэрных — гэта ж будзе толькі на карысць усяму беларускаму руху, нашай Бацькаўшчыне, кожнаму з нас. Так што — дзяліцеся сваім досведам беларускіх дабрачынных спраў, сябры!

ТРАДЫЦЫІ

Калядныя вечары ў касцёле

У Мінскім касцёле Святога Роха ў святочную пару гучала інструментальная і арганная музыка

Касцёл Найсвяцейшай Тройцы (Святога Роха) збіраў на Калядныя вечары шмат прыхільнікаў духоўнай музыкі, якая дапамагае нам глыбей адчуць таямніцу Раства. Фэст “Калядныя вечары на Залатой горцы” ладзіцца з 2003 года. Хоць штораз там — новая праграма, ды нязменна пераважаюць кампазіцыі духоўнага зместу. Да таго ж у каталіцкай святыні абавязкова гучыць арган: унікальны інструмент чэшскай фірмы “Riegerkloss” жыве ў Алтарнай частцы храма з 1986 года.

Гэтымі Каляднымі вечарамі на аргане гралі беларускія выканаўцы Вольга Падгайская, Аляксандр і Юлія Бурдзялёвы, Кацярына Нікалаева, госці з Санкт-Пецярбурга Дзіна Іхіна і Дзяніс Маханькоў. Ладзіўся канцэрт студэнтаў спецыялізацыі “Арган” Беларускай дзяржакадэміі музыкі (клас дацэнта Уладзіміра Неўдаха). Арганіст касцёла Віктар Кісцень граў творы І.-С. Баха, С. Манюшкі, М. Рэгера, Р. Свірыдава і свае ўласныя. Яшчэ студэнтам аддзялення кампазіцыі Акадэміі музыкі ён аблюбаваў залатагоркаўскі арган. У 1996-м прыйшоў у касцёл, каб агучыць свае “Варыяцыі для аргана”. Потым граў на Святой імшы. Так і прыкіпеў сэрцам да аргана, касцёльнай музыкі. Кампазітару яшчэ грэе сэрца, што яго асабістыя музычныя творы даспадобы парафіянам.

ВІКТАР КІСЦЕНЬ

Артысты фальклорных гуртоў “Перлинка” і “Ватра” на канцэрце

Каляднымі вечарамі ў касцёле гучалі й свецкія душэўныя мелодыі. 5 студзеня прайшлі Каляды ў фальклорным стылі: выступілі ўзорны фальклорны гурт з Украіны “Перлинка” ды гурт украінскай песні й абраду “Ватра” (дарэчы, ён з Мінска: дзейнічае пры Рэспубліканскім цэнтры нацыянальных культур). “На радаснае свята Божага нараджэння мы можам сабе дазволіць і крыху больш інструментальнай музыкі”, — патлумачыў мне мастацкі кіраўнік фэсту Віктар Кісцень.

Даў канцэрт ансамбль “Bon voyage”, што сабраў музыкантаў са скрыпкай, віяланчэллю, флейтай ды іншымі інструментамі. Канцэрт музыкі барока на гістарычных флейтах падараваў ансамбль “Brevis”.

А сяброўства між касцёлам Святога Роха й выканаўцамі класічнай музыкі — даўняе: святыня была залай камернай ды арганнай музыкі пры Белдзяржфілармоніі ў 1983—2006 гадах. Потым філармонія між канцэртамі дазваляла каталікам праводзіць набажэнствы, цяпер жа вернікі не супраць музканцэртаў у будынку, які перайшоў да іх. Адно слова: добразычлівасць! Каталікі ўдзячныя музычным выканаўцам: калі б дзеля патрэб апошніх у савецкі час не быў устаноўлены ў святыні арган і яна не пераўтварылася ў канцэртную залу, то й невядома, ці была б увогуле адноўлена.

У плыні фэсту працавала фотавыстава “Арганы. Еўрапейская спадчына Беларусі”. Экспазіцыю блаславіў арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч, Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі.

Ганна Лагун

СВЯТОЧНЫ НАСТРОЙ

Рознамоўны Дзед Мароз

Мінчанін Аляксандр Семяновіч рассылае відэавіншаванні на розных мовах — у розныя краіны

У пошце “Голасу Радзімы” — дзясяткі віншаванняў: у асноўным прыйшлі па элпошце ад актывістаў беларускіх суполак замежжа, няштатных аўтараў. Ёсць паштоўкі, званкі, СМСкі... Усім — дзякуй! Усім, хто застаюцца з намі на сувязі, прывітанне. І віншаванне з чатырма святамі: Калядамі, Новым годам, Раством Хрыстовым ды — са Старым Новым годам... Святкаванні ў Беларусі пачынаюцца 25 снежня з Каляд. Гэтае народнае свята ўшанавання Сонца — найстарэйшае, збераглося з язычніцкіх часоў. Дату Калядаў пры любой уладзе й календары вызначае Сонца, ягоны паварот на вясну.

У пошце ёсць і пасланне ад Аляксандра Семяновіча: з беларускай песняй, відэа і віншаваннямі на розных мовах. Дарэчы, на ёлках ён выконвае ролю Дзеда Мароза — магічную сілу мае! Слухаем. Беларуская, руская, французкая, англійская, нямецкая, польская, італьянская, іспанская, чэшская — 9 моваў! Мы ўдакладнілі па тэлефоне: выпускнік Мінскага інстытута замежных моў (1974) вывучаў французкую і нямецкую — на іх размаўляе. Іншыя асвоіў самавукам, на некаторых чытае. І ўкраінскую ведае (спяваў “Несе Галя воду”, “Ніч яка місячна”, “Рідна маты моя”...). З часу працы перакладчыкам, у Бюро міжнароднага маладзёжнага турызму “Спадарожнік” сяброў мае ў розных краінах. З французам Марысам Талабарам сябруюць з лета 1973-га. На здымку — яны разам у Марсэлі, на ўзбярэжжы Міжземнага мора. То й мы жадаем сябрам “ГР” у Новым годзе — верных сяброў, паразумення з імі, цёплых і сонечных дзён ды Мора Радасці.

Іван Ждановіч

Аляксандр (справа) і Марыс. Францыя, ліпень 1996.

ТАЛЕНТЫ З ДЫЯСПАРЫ

Суботні канцэрт у Клайпедзе

У канцэрце, зладжаным Беларускай суполкай "Крыніца" ў гонар Году малой радзімы, паўдзельнічалі таленавітыя спевакі Валянціна Снігур і Сяргей Шабадалаў

У суботні снежаньскі вечар Цэнтр нацыянальных культур горада Клайпеды ў чарговы раз адчыніў дзверы для ўсіх ахвочых далучыцца да беларускай культуры. Утульная зала цэнтра — перапоўнена, тут заўсёды рады нас бачыць: сяброўская атмасфера, цёплыя й шчырыя стасункі. Тут можам адпачыць, пагаварыць па-беларуску, атрымаць добрую параду ці дапамогу. Прадстаўнікі розных нацыянальнасцяў адгукнуліся на запрашэнне наведаць канцэрт "Усё, што поўніла нам сэрца...", зладжаны Беларускай суполкай "Крыніца" й прысвечаны Году малой радзімы. Імпрэза падаравала слухачам мора станоўчых эмоцый, прыемных успамінаў аб Радзіме, гадах дзяцінства ды юнацтва. І ўсім было што ўспомніць, бо пакінулі ж мы родныя мясціны даўно, і справы, межы, кіламетры заўжды паміж намі й Бацькаўшчынай. Дапамаглі ж нам зноў наблізіцца да яе таленавітыя выканаўцы, пра якіх і раскажу.

Валянціна Снігур — салістка, нязменная кіраўніца фальклорнага гурта беларускай песні "Купалінка" пры Беларускай суполцы "Крыніца" горада Клайпеды з моманту яго стварэння (кастрычнік 2005). Гурт не раз ужо станавіўся лаўрэатам міжнародных конкурсаў, паўдзельнічаў у розных літоўскіх фестывалях і святах, у другім Фэсце мастацтваў беларусаў свету ў Мінску (2014). Гурт запрашаюць выступаць у розныя гарады Літвы, за яе межы. А тры гады таму па ініцыятыве Валянціны, пад яе кіраўніцтвам і таксама пры беларускай суполцы горада ўзнік дзіцячы фальклорны гурт "Верасок". Ён ужо — дыпламант Міжнароднага фальклорнага фестывалю "Покровские колокола" ў Вільнюсе. Не толькі за шэраг заслуг любяць клайпедчане Валянціну Снігур — найперш за яе сардэчнасць і шчырасць, за вялікі прыродны талент. Ведаю: на гарадскіх імпрэзах яе выступу на сцэне гледачы чакаюць з нецярпеннем. І мы, сябры "Крыніцы", некалькі гадоў чакалі яе сольны канцэрт. Але ж — і сціпласць Валянціны, і клопаты, жаданне зрабіць усё як найлепш уносілі карэктывы ў планы. Ды шчаслівы выпадак звёў яе на адной сцэне з Сяргеем Шабадалавым. Таленавіты выканаўца беларускіх песень — з Вісагінаса, гэта больш за 400 км ад Клайпеды. Пры падтрымцы, непасрэдным удзеле гэтага рознабакова адаронага чалавека і ўдаўся, пры поўным аншлагу, канцэрт у Клайпедзе. А "маторам", галоўным арганізатарам імпрэзы стаў Ганаровы консул Беларусі ў Клайпедзе, старшыня суполкі "Крыніца" Мікалай Логвін.

З радасцю віталі мы ў сябе Сяргея Шабадалава. Ён — саліст гурта "Світанак", актывіст БКЦ "Крок" з Вісагінаса, член Кансультатыўнага савета па справах беларусаў замежжа пры МЗС Беларусі, сябра Рады Згуртавання беларускіх грамадскіх арганізацый Літвы. Цягам 10 гадоў Сяргей — і аўтар сцэнара, і рэжысёр, і вядучы штогодняга "Свята беларускай песні": яго ладзіць ЗБГА Літвы. Ён і шматразовы ўдзельнік, вядучы свята "Купалле". Хоць апошнія тры гады Сяргей сольна выконвае беларускія песні, але застаецца й салістам гурта "Світанак". Удзельнічаў у многіх міжнародных фэстах, творчых сустрэчах, канцэртах у Літве, Беларусі, памежных краінах. Песні аб роднай Беларусі, малой Радзіме, пра каханне, а таксама жартоўныя песні, народзі, вершы, жарты — шмат чаго ёсць у яго рэпертуары. На канцэрце кожнаму нешта лягла на сэрца. Сяргей асобна вылучыў песні на словы Станіслава Валодзькі, творчасць якога ведаюць многія гурты й выканаўцы Літвы. Прагучаў блок песень на вершы беларускага паэта з Даўгаўпілса ў выкананні Сяргея й Валянціны: "Позірк Еўфрасінні", "Матулін пірог", "Чаромха", "Рабіны", "Сена духмянае", "Касцёр для дваіх", пераклад на беларускую мову песні "Галіна". Сяргей плануе запісаць кампакт-дыск песень на словы Станіслава Валодзькі, з якім даўно плённа супрацоўнічае.

Мікалай Логвін (у цэнтры) дзякуе за выдатны канцэрт артыстам Валянціне Снігур і Сяргею Шабадалаву

Канцэрт пачаўся ды скончыўся дуэтам таленавітых выканаўцаў. Напрыканцы імпрэзы Мікалай Логвін падзякаваў усім прысутным у зале за іх любоў і цікавасць да беларускай культуры, а выканаўцам — за выдатны канцэрт. Мікалай Аляксеевіч таксама ўручыў Валянціне Снігур і Сяргею Шабадалаву падзякі за працу й таленты, а таксама сувеніры на памяць пра цёплую сустрэчу.

Наталля Дамненка,
намесніца старшыні
Беларускай суполкі
"Крыніца", г. Клайпеда

НАПЯРЭДАДНІ ПАДЗЕІ

Янка Купала на Мінскай кніжнай выставе

Прысвечаная Песняру выстава будзе дэманстравацца на вялікім Кніжным форуме

Па традыцыі ў Мінску з 6 па 10 лютага 2019 года пройдзе чарговая Мінская міжнародная кніжная выстава-кірмаш. Сярод іншых прэзентацый, імпрэз, аўтограф-сесій — і адмысловая перасоўная выстава "Завуся я толькі Янка Купала" (на беларускай і англійскай мовах). Арганізатар яе — Дзяржаўны Літаратурны музей Янкі Купалы. "Мы ведаем, што ў 2019 годзе Краінай — Ганаровым госцем на беларускім кніжным кірмашы будуць Злучаныя Штаты Амерыкі, — расказвае дырэктар Купалаўскага музея Алена Ляшковіч. — Відавочна, шырока будзе гучаць англійская мова. Таму мы вырашылі расказаць пра творчасць нашага класіка і па-англійску. Магчыма, і гасцям са Злучаных Штатаў Амерыкі будзе цікава даведацца пра повязі народнага песняра Беларусі з амерыканскай тэмай. Янка Купала быў добра знаёмы з амерыканскай літаратурай. У адным са сваіх публіцыстычных артыкулаў пісаў пра свае чытацкія зацікаўленні творчасцю Эдгара По, Уолта Уітмэна, Тэадора Драйзера і Эрнэста Хэмінгуэя".

Таксама Купалаўскі музей правядзе ў час кніжнай выставы-кірмашу грамадска-культурную акцыю "Чытаем Купалу разам", у час якой будуць гучаць вершы беларускага класіка на розных мовах народаў свету. У чарговы раз будзе прэзентаваны і адмысловы зборнік Янкі Купалы "А хто там ідзе?" на мовах свету", дзе легендарны верш класіка надрукаваны на 101 мове. Магчыма, чытачы ўбачаць і перавыданне зборніка "Санеты" Янкі Купалы — кнігі, дзе будуць змешчаны творы славутага цыкла ў перакладзе болей як на дваццаць моў. Над гэтым творчым праектам рупяцца ў выдавецтве "Мастацкая літаратура". Вось што на гэты конт патлумачыў дырэктар выдавецтва, паэт і літаратурны крытык Алесь Бадак: "У свой час кніга купалаўскіх санетаў на мовах народаў свету, укладзеная вядомым літаратуразнаўцам Вячаславам Пятровічам Рагойшам, мела шырокі розгалас. Цяпер да ўжо добра вядомых перакладаў дадаліся й перастварэнні "Санетаў" на сербскую, чачэнскую, чувашскую, кітайскую ды іншыя мовы. І праца над укладаннем кнігі яшчэ доўжыцца. Хацелася б у гэтым міжнародным творчым праекце аб'яднаць розныя народы, розныя краіны, розныя нацыянальныя літаратуры".

Кастусь Ладуцька

Алена Ляшковіч з юнымі беларусамі Аргенціны

Ад рэдакцыі. На сайце Купалаўскага музея ў інтэрнэце перад Новым годам змешчана была цікавая інфармацыя (з прыгожымі фотаздымкамі!) пра тое, што 14 снежня 2018 года ў Нацыянальным кангрэсе Аргенціны адкрылася выстава "Завуся я толькі Янка Купала" з фондаў Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы. Прайшла там і ўрачыстасць-прэзентацыя, зладжаная сумесна Купалаўскім музеем ды Амбасадай Беларусі ў Аргенціне. "На адкрыццё сабралася больш за сто чалавек! — паведамляюць купалаўцы-музейшчыкі. — Гучалі вершы Янкі Купалы на мове арыгінала і ў перакладзе на іспанскую мову". Шчырую ўдзячнасць захавальнікі Купалаўскай спадчыны выказваюць Надзвычайнаму і Паўнамоцнаму Амбасадару Беларусі Уладзіміру Астапенку і Консулу Беларусі Паўлу Міронаву — за ўшанаванне памяці Песняра ў Аргенціне.

На сайце ж чытаем: 15 снежня выстава "Завуся я толькі Янка Купала" прэзентавалася і ў клубе суайчыннікаў "Виссарион Белинский" у прыгарадзе Буэнас-Айрэса, Сан Марцін. У тым клубе, што вельмі парадавала гасцей з Беларусі, ёсць зала Янкі Купалы. Там прадстаўлены й матэрыялы з Дзяржаўнага Літаратурнага музея Янкі Купалы, што былі перададзены яшчэ ў 2002 годзе. "Цяпер мы перадалі ў дар клубу адбіткі графічных работ Янкі Раманоўскага і Арлена Кашкурэвіча, — удакладняюць музейшчыкі. — Было немагчыма без хвалявання глядзець і слухаць беларускія, украінскія ды рускія песні й танцы ў выкананні самадзейных артыстаў! Як важна, што яны любяць сваю гістарычную Радзіму і ганарацца ёй! Наша выстава перададзена ў дар Амбасадзе Беларусі ў Аргенціне, яна праедзе па ўсёй краіне і будзе паказана ў клубах дыяспары".

У тых, хто ездзіў за акіян — а на здымках бачым і дырэктара Купалаўскага музея Алену Ляшковіч — засталіся самыя цёплыя й шчымлівыя ўражанні ад сустрэч з беларусамі Аргенціны.

КНІЖНЫ СВЕТ

Нашы ёсць і там сляды

Прадаўжаецца выданне кніжнай серыі "Адрасы Беларусі ў свеце"

Выдавецкі дом "Звязда" выдаў тры кнігі серыі "Адрасы Беларусі ў свеце". Кожны з тамоў расказвае пра повязі з нашай краінай тых ці іншых месцаў на планеце. Першая кніга была прысвечана беларуска-расійскім стасункам. Другая — расказвала пра ўкраінскія адрасы беларускай культуры, пра нашых землякоў ва Украіне.

Запланаваны да выдання чарговы праект. Гэтым разам "Адрасы Беларусі ў свеце" прывядуць нас у цэнтральнаазіяцкія краіны: Казахстан, Кыргызстан, Таджыкістан, Туркменістан, Узбекістан. Пад адной вокладкай сабраны нарысы, карэспандэнцыі, артыкулы, якія расказваюць пра нашых землякоў, што ў розную пару трапілі ў тыя краіны. Нарысы лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі Алеся Марціновіча расказваюць пра Адама Сузіна, Адольфа Янушкевіча, Сымона Хурсіка, Мікалая Пржавальскага, Аляксандра Ходзьку, якія вандравалі ў Цэнтральнай Азіі, збіралі сведчанні гісторыі, прыгожага пісьменства, іншыя артэфакты, што падкрэсліваюць годнасць і гонар розных народаў. У кнізе ёсць таксама згадкі пра казахаў, кыргызаў, таджыкаў, туркмен, узбекаў, якія ўнеслі сваю долю працы ў развіццё стасункаў Беларусі з іншымі краінамі. Чытач пазнаёміцца з "беларускасцю" перакладчыкаў, пісьменнікаў, вучоных Адзія Шарыпава, Нурлана Аразаліна, Таўшан Эсэнавай, Гулрухсор Сафіевай, Саліма Зарофшанфара, Зульфіі...

Асобнае месца ў выданні займаюць творы беларускіх паэтаў, прысвечаныя далёкім прасторам ды іх насельнікам: "Гаспадыня Медэо", "Джайляу" народнага паэта Беларусі Рыгора Барадуліна, "Гульсары (Чынгізу Айтматаву)", "Светлай памяці Муміна Канаата" Міколы Мятліцкага, "Таджыкістан" Веры Вярбы, вершы Максіма Танка, Казіміра Камейшы, Вольгі Іпатавай...

Мікола Берлеж

СПАДЧЫНА

Лён кладзецца ў лёсу палатно

У “Куфар беларускіх скарбаў”, што збіралі ў Даўгаўпілсе, паклалі льняное палатно

ІРЫНА ХАЖЭУСКАЯ

Прыгожымі атрымаліся фінальныя вячоркі праекта “Куфар беларускіх скарбаў”

Чытачы “Голасу Радзімы” ведаюць пра наш праект “Куфар беларускіх скарбаў”, які прысвячаўся 100-годдзю Латвійскай Рэспублікі. Летась у сярэдзіне кастрычніка ў Цэнтры беларускай культуры прайшла фінальная вечарына праекта, тэмай яе стаў лён і льняныя палотны. На тых вячорках мы й зачынілі куфар, які напаўнялі народнымі вырабамі цягам года, — і яны дэманстраваліся на фэсце “Беларускі кірмаш у Даўгаўпілсе”. (Гл.: “Шматгалосае рэха з Айчыны” — ГР, №35, 14 снежня 2018 г. — **Рэд.**)

Кожная імпрэза праекта прыцягвала ўвагу да нейкага аднаго з прадметаў, якія можна знайсці ў бабуліным куфры. І штомесяц у “Куфар беларускіх скарбаў” мы складвалі сакральныя аўтэнтычныя вырабы: тканыя й вышытыя ручнікі, плеценыя паясы, пашытыя нацыянальныя касцюмы, абрусы, кілімкі, ходнікі — усё тое, што называюць рукатворнай матэрыяльнай спадчынай беларусаў. І так патрохі мы падышлі да таго, што лічыцца асновай асноў беларускага побыту й культуры: лёну і льняных палотнаў.

Многія беларускія паэты апявалі лён. Гэта — сімвал нацыі, брэнд краіны: кветкі расліны ёсць і на Дзяржаўным гербе. Льняная тканіна трывала спалучана з велізарнай беларускай культурай, у тым ліку й вуснапаэтычнай, песеннай творчасцю. З палатна рабілі й нацыянальныя ўборы. Толькі з лёну ткаліся беларускія ручнікі, на якіх вышываўся арнамент. З лёну й сёння шыюцца як нацыянальныя строі, так і сучасныя адзенне і аксэсуары, лялькі, ручнікі, пасцельная бялізна, робяцца дывановыя дарожкі.

Заключную імпрэзу праекта мы зладзілі як вячоркі, у аснове было тэатральнае дзеянне. Вячоркі, як вядома, былі традыцыйнай сезоннай формай правядзення вольнага часу ў нашых продкаў. Пачыналіся пасля заканчэння летне-восеньскіх палявых работ, кульмінацыя ж прыходзілася на пару да і пасля Каляд. Дзяўчаты на вячорках спачатку шылі, пралі, вязалі, ціха размаўлялі, спявалі працяглыя песні, а потым наставаў час гульняў і танцаў. Вось і на вячоркі ў сельскую хату сабраліся нашыя жанчыны (гурт народнай песні “Купалінка”), якія селі на лаўкі ды за няспешнай гутаркай вышывалі, вязалі, пралі, спяваючы беларускія песні. А Гаспадыня (Галіна Сантоцкая) і Гаспадар (Віталь Міхайлоўскі) разыгралі гумарыстычную пастаноўку, згулялі з гасцямі ў пацешную даўнюю беларускую гульню “Канапелькі”.

У той вечар усё ў нас было прысвечана Яго Вялікасці Лёну. Вядучая вечарыны, кіраўніца ЦБК Жанна Раманоўская дастала з куфра вялікі скрутак (яго называлі сувой) ільнянога палатна і распавяла пра шматлікія, працаёмкія этапы стварэння палатна. Колькі ўсяго трэба зрабіць, каб з маленькага льнянога насення ўрэшце атрымаць багатае і прыгожае палатно! З якога беларускія дзяўчаты, жанчыны шылі многія неабходныя ў жыцці рэчы, без якога не маглі абысціся ў побыце. Спадарыня Жанна паказала прадметы працы, якімі карысталіся нашы продкі, каб апрацаваць лён: церніцу, грэбень, шчоткі, верацяно, трапло. Распавяла шмат цікавага пра вытворчасць лёну — тым сяляне займаліся ў Беларусі са старажытных часоў. І яшчэ дастала вядучая з куфра патаемныя і каштоўныя скарбы: упрыгожанні ды маленькі вузельчык са старадаўнімі грашыма.

Казка-быль пра лён, пачутая ад бабулі, жартоўныя народныя песні й прыказкі Гаспадыні, вершы й загадкі ад паэта Станіслава Валодзькі, зухаватая полька Матлёт ад танцавальнага гурта “Лянок”... Потым яшчэ сцэнічна абыграная песня “Пасеялі дзеўкі лён” у выкананні вакальнага гурта “Пралескі”, знакамітая песня “Сіні лён” (яе харавая капэла “Спадчына” спявала на беларускай, рускай і латышскай мовах), займальны аповед і верш, а таксама акапэльная песня ад сяброўак суполкі “Уздым” Яўгеніі Гуляевай і Зінаіды Сіліні. Потым былі вершы пра лён, з душой прачытаныя Тэрэзай Паўлавай, Ліліяй Воранавай, Марыяй Памецькай, Інэсай Казлоўскай, Інай Валюшкай... Увесь калейдаскоп з яркіх і цікавых нумароў гледачы ўспрымалі з непадробнай цікавасцю.

Лагічнае завяршэнне праект “Куфар беларускіх скарбаў” меў на вышэйзгаданым “Беларускім кірмашы”. Дарэчы, з макулінак кожнай імпрэзы праекта складзена была ўся аснова гала-канцэрта. І мы ўжо ствараем у ЦБК цікавую экспазіцыю “Беларуская хатка” — з падораных нашымі сябрамі экспанатаў. То як будзе-це ў Даўгаўпілсе — заходзьце на вул. Алеяс, 68-1А: у нас ёсць на што паглядзець. Запрашаем усіх, каго цікавіць багатая беларуская гісторыя й культура, яе матэрыяльная і нематэрыяльная спадчына, наведаць імпрэзы Беларускага дома.

Марыя Памецька

МЕРКАВАННЕ

Я — за газету друкаваную!

Мінулай восенню, ведаю, у актывістаў беларускіх суполак дыяспары пыталіся: ці патрэбная нам будзе надалей газета “Голас Радзімы” ў друкаваным варыянце? Цяпер многім даступны інтэрнэт — то можа дастаткова размяшчаць газету на сайце, рассылаць у суполкі нумары ў электронным фармаце?

Безумоўна, шмат хто чытае газету ў інтэрнэце. І мы, беларусы ў Даўгаўпілсе, гэтай зручнасцю ахвотна карыстаемся. Застаемся актыўнымі інтэрнэт-чытачамі газеты з Бацькаўшчыны. Вельмі чакаем кожны нумар “Голасу Радзімы”! І спрыяем пашырэнню: ПДФ-варыянт кожнага нумара рассылаем на электронныя паштовыя скрынкі сябрам, якія сталі актыўнымі карыстальнікамі сусветнай сеткі.

Але яшчэ больш, чым “ГР” у інтэрнэце, мы чакаем паштальёна з друкаванымі нумарамі “Голасу Радзімы”. Яны нам пахнуць Радзімай! Іх, аддрукаваныя ў колеры, на цудоўнай паперы, так прыемна браць у рукі. Гэта ж, дарэчы, вельмі працуе на імідж Беларусі! У нас ёсць падшыўкі за шмат гадоў. Свежыя газетныя старонкі вывешваем на Дошку аб’яў. І ёсць завядзёнка: па газетным нумары даём тым сябрам, пра якіх напісана ў чарговай публікацыі. Мяркую, трэба ўсё ж, прымаючы рашэнне — быць ці не быць папяровай версіі “ГР” — улічваць: большая колькасць актывістаў дыяспар — людзі сталага ўзросту, з акулярамі... Далёка не ўсе ў інтэрнэце “сядзяць”. А станоўчых эмоцый у нас больш ад чытання газеты на паперы. Таму я — за газету друкаваную, высокай паліграфічнай якасці, якую можна ўзяць у рукі ды ўважліва, доўга, з цікавасцю чытаць. Даць іншаму. І зберагчы — на доўгія гады: для сябе, для нашчадкаў.

Жанна Раманоўская, г. Даўгаўпілс

КАРЫСНЫ ДОСВЕД

Наш сябар — універсітэт

Падпісана Дамова аб супрацоўніцтве паміж Даўгаўпілскім цэнтрам беларускай культуры і Віцебскім дзяржаўным універсітэтам імя Пятра Машэрава

Заўважана: кола сяброў пашыраецца ў таго, хто сам умее сябраваць. Да таго ж, калі размова ідзе пра сяброўства між рознымі арганізацыямі, ды з розных краін, важна свае намеры замацоўваць адпаведнымі дамовамі. Дзеля чаго? Мы не раз пераконваліся: тады значна прасцей вырашаць розныя арганізацыйныя пытанні, калі ёсць нагода для сустрэчы сяброў.

Напрыканцы мінулага года яшчэ адзін сяброўскі адрас з’явіўся ў беларусаў Даўгаўпілса. У лістападзе ў Віцебскім дзяржуніверсітэце імя Пятра Машэрава пабывалі дырэктарка Цэнтра беларускай культуры, старшыня суполкі “Уздым” Жанна Раманоўская і сябар Саюза пісьменнікаў Беларусі Станіслаў Валодзька. Там была заключана Дамова аб супрацоўніцтве паміж Даўгаўпілскім цэнтрам беларускай культуры і Віцебскім дзяржуніверсітэтам, якую падпісалі Жанна Раманоўская і рэктар універсітэта Аляксей Ягораў. Затым прайшла сустрэча са студэнтамі й выкладчыкамі філалагічнага факультэта: спадарыня Жанна прэзентавала работу ЦБК і “Уздыма”, а спадар Станіслаў чытаў свае вершы. Іх чыталі, дарэчы, таксама й студэнты. Цікавым было й знаёмства гасцей з універсітэцкім Літаратурным музеем.

Разам з сувенірамі госці атрымалі ў падарунак зборнік “Літаратурныя ўзаемасувязі Віцебшчыны й Латгаліі”, выдадзены ў гэтай вну. У шэрагу іншых навуковых работ у ім ёсць артыкулы Вольгі Русілкі “Літаратурныя ўзаемасувязі Віцебска й Даўгаўпілса ў XX—XXI стагоддзях” і “Творчасць латгальскага паэта Аляксея Салаўёва”, Ванды Бароўкі “Геапаэтыка ў творчасці пісьменнікаў Віцебшчыны й Латгаліі ў другой палове XX — пачатку XXI стагоддзя” і “Творчасць Віктара Вальтара і беларуская класіка пачатку XX стагоддзя”, Іры-ны Саматой “Беларус Латгаліі: творчы партрэт Станіслава Валодзькі”, Вольгі Лапацінскай “Пастаноўка п’ есы Яна Райніса “Ветрык, вей!”: параўнальны аспект”.

Марыя Памецька

Дэлегацыя беларусаў з Даўгаўпілса ў Віцебскім дзяржуніверсітэце

Зярняткі майго лёсу

Уладзімір Банцэвіч разам з юнымі мастакамі-выхаванцамі ўрачыста дорыць мазаічны партрэт атамана Платава ў калекцыю Мірскага замка. 11 ліпеня 2018 года.

Спадчыннасць

Я, можа, і не варты таго, каб гукаць думкі, шукаючы ў шляху сваім — удалечыні ад Бацькаўшчыны — нейкае сабе апраўданне. Ды жыццё — адно, і некалі ж трэба выгаварыцца.

Вельмі тужліва мне часам бывае ў сённяшнім побыце. Тая раніца светлая, з палескага дзяцінства, даўно знікла — нібы сіняя птушка незабыўная, калыхнуўшы ў нябёсах вясёлкавым крылом. А не знікла вясёлка, якую ў дзяцінстве ўпершыню пабачыў. Яе згадваю, калі навокал мяне штосьці вельмі маркотнае адчуваецца. І трывога, як тая рысь, крадзецца ў маім Заказніку: мягенька, бязгучна... Ды сэрца — не футра: кожны яе кіпцюрык адчувае балюча. Навошта мне тыя туга ды маркота, навошта трывога? Але ж пакуль жывы — не магу не пазіраці, не магу не адчуваці.

Там, на палескім балоце, я хацеў сюды: у сваю будучыню. Цяпер жа з ваколіц Дона — імкнуся ўсёй душой туды, дзе рэчка Лань яшчэ русалкаю лясною, з лотаццю-кветкамі ў космах зялёных водарасцяў, ціха сплывае між лазняку й крушыны, бяроз і алешын. Эх, няма цяпер толькі тых бяроз і алешын, а Лань ужо й не русалка лясная — у полі канава прамая. І ад яе дзявочай прыгажосці не засталося й рэшткаў.

“Дзе ж ты, казачны край мой?” — парываецца сэрца гукнуць. Толькі казкі ў дзяцінстве маім засталіся, а дзяцінства той кошык лазовы — мо ў лесе калісьці згубіў?.. Але ж, наперакор цемрыву, іду я да святла. І светлы абразок маёй цудоўнай Радзімы ніколі не знікне, пакуль на зямлі ёсць беларусы: дзе б ні жылі мы. Бо паўсюль з намі — наша спадчыннасць. Усюды родных мне людзей магу пазнаць па светлым і спагадлівым позірку, а яшчэ — па сціпласці прыроднай, працавітасці. Тая спадчына беларускасці ў нас у крыві, у душы, у розуме... Як векавечная ахова нам у свеце, пранізаным халоднымі скразнякамі трывог.

Кужалёвы ручнік

Мая любая Радзіма! Ты, як матуля, выпесціла, узгадавала мяне ў нялёгкую для цябе пасляваенную гадзіну. Роднае Палессе назаўсёды ў душы зберагаю — з верасковай дрымотай яго, журавіннымі коўдрамі, незабыўным духмяным настоем сунічных палян. Ах, як хочацца часам дадому! Дзесьці там, на поўнач, пад знаёмым каўшом Вялікай Мядзведзіцы мой позірк блукае па небе: шукае зорку дзяцінства, юнацтва майго.

Ніколі не забыць мне тых росных ранкаў. Там на поплаве, па світанні разгортвалі жанчыны доўгія шэрыя палотны: каб станавіліся яны пад сонечнымі промнямі, пад бялёсымі траўнымі росамі белымі й прыгожымі. Цудоўнай якасцю яшчэ адной валодаюць палатняныя “сцежкі”: як тыя абярэгі, дораць нам цяпло сонейка й матуліных рук. І кожны, хто апранае матуліну светла-вышываную кашулю, хто ўціраецца ўранні белізною пахучаю тых ручнікоў — праз кужалёвыя ніці таемныя повязі з родам, народам, радзімай зямліцаю ладзіць.

Заўсёды хвалююся трохі, як бачу ў крамах ільняныя ручнікі. Альбо з каляровымі кветкамі абрусы. Мне хочацца іх не тое што купіць — хоць бы патрымаць у руках, памацаць іх жасткаватую, але ж вельмі знаёмую фактуру. І адразу: нешта цёплае і радзімае нібы светлаю хваляй уздымаецца ў мяне ўнутры. А можа гэта вытворы з тых паплавоў майго дзяцінства?.. Хаця ж ведаю, што цяпер — машыны ўсюды, і палатно бялюткае ствараецца ўжо не так. Але ж сувязь — праз памяць далоняў, праз кужалёвыя ніці — з радзімай зямлёй, белымі росамі, з ранішнім сонейкам заўсёды паднаўляецца. І я купляю той абрус ці ручнік — як з дзяцінства дзівосную згадку, каб асвечвала хату часцінка жывая маёй любай старонкі.

“З добрым ранкам!” — кажу я штодзённа, калі ў рукі бяру гэты светлы ручнік кужалёвы.

Крыж

З дзяцінства помніцца: на сяле — так у нашай вёсцы называўся цэнтр — пры скрыжаванні галоўных вуліц стаяў высокі драўляны крыж. Ён быў апаясаны мноствам палатняных ручнікоў з хрысціянскай сімволікай. Мы, вясковыя хлапчукі, у нейкіх сваіх гульнях насіліся паблізу, нібы й не заўважаючы той звычны для вока крыж. А ён, абветраны, пацямнелы ад дажджоў і сонечных промняў, стаяў — як былінны старац, і матылялася ў яго на ветры бялёсая палатняная “барада”. Нам ніхто ніколі не расказваў: хто яго і калі там паставіў, з якое патрэбы. Але ж таямнічае нешта для нашага дзіцячага розуму было ў тым простым вырабе. Чаму ён стаіць прама тут, у цэнтры сяла? Можа, гэта неяк звязана з нейкімі трагічнымі падзеямі ваеннага ліхалецця? Мы, дзеці, тое так і не ўведалі. У тыя суровыя гадзіны й не прынята было пытацца ў дарослых пра нешта патаемнае, адрываць іх ад штодзённых спраў. Рана станавіліся дарослымі дзеці нашага часу — у бацькавых керзавых чобатах, у паношаных да дзірак куфайках.



Уладзімір Банцэвіч. “Мая Беларусь”.

А нядаўна, раптоўна для сябе, я зрабіў невялічкае адкрыццё. Аказваецца, вуліцы сяла ў сваім плане, па баках свету, скрыжоўваліся з галоўнай вуліцай так, што нагадвалі ўсе разам праваслаўны крыж. Галоўная вуліца пралягла ад нізу таго крыжа на заходзе, дзе мясціны былі балотныя й называліся Чарцеж, на ўсход. Вяршыня крыжа з яго перакрэсцем — на самай высокай мясціне, якую называлі Гарой. А за ёй ужо было возера. Я палічыў: гэта не выпадкова, і вельмі сімвалічна. Бо й тое возера, над такім геадэзічным “крыжам”, было як неба: у ім люструюцца белыя аблокі. Пэўна, буслы, прылятаючы штогод у нашыя мясціны, такім вялікім крыжам, з небам на вяршыні, бачылі вёску з вышыні.

Мы, дзеці, усе былі роўныя перад будучыняй на гэтых вясковых вулачках. А мінулае, вайна былі вельмі блізка, нагадвалі ўсюды сваімі смяротнымі слядамі. Дарослыя імкнуліся пра мінулае не думаць. Як вандроўнік збягае ад гіблай мясціны, так і люд са сваімі добрымі марамі — кіруецца ў будучыню, падалей ад гора, бяды і страт. Месцам дзіцячых гульняў была невялікая плошча на Гары, дзе й стаяў крыж. Нібы добры Гасподні вартаўнік, ён ахоўваў нас і нашае ціхае шматклапотнае жыццё ад розных непрыемнасцяў. А мы, вераб’інае племя, дзеці пасляваенных 50-х, ужо ў 70-я разляталіся хто куды. Мы выраслі пад крыжам нашага дзяцінства, і далей кожны ўжо нёс жыццёвы свой крыж — хто як мог. Напоўненыя вятрамі юнацтва, мы ўжо адчувалі сябе шчаслівымі, бо не ведалі, якая будучыня чакае нас. Незнаёмыя шляхі, далёкія мясціны й гарады... І ў мяне ўжо быў горад мары. Пра Растоў-на-Доне часта расказвала мая маці, бо гэты горад быў некалі горадам яе дзяцінства і юнацтва. Праўда, прайшлі яны ў дзіцячым доме, бо яе маці рана пакінула свет, а бацька ў тыя гады быў кадравым ваенным.

Не раз на сенакосе я праз шапатлівую лістоту дрэў, балотнага кустоўя ўглядаўся ў паўднёвае неба, пад якім, ведаў, жыве той цудоўны горад. Прыцягвала таямнічая далеч, і ў балотных міражах нібыта бачыліся абрысы яго. Там, пэўна ж, усё не так, як на балоце... Мая маленькая мара заўсёды мне дапамагала ў цяжкія хвіліны. Вечарам, кінуўшы позірк на поўдзень, я радаваўся, што бачу тыя ж зоркі, што й жыхары горада, і тое збліжала мяне з імі. Але сялянскае жыццё з яго суровай рэальнасцю моцна трымала мяне пры сабе. Мы, агальцы, нароўні з дарослымі неслі ўжо — кожны свой крыж.

Толькі з гадамі я спазнаў сапраўдны кошт пары пад назваю дзяцінства. Хоць і трохі пакутлівай ды нясытнай была тая пара, ды ўсё роўна — цудоўнаю. Бо там я быў чыстым, светлым, як кажуць, душой і целам. І нёс невялікі свой крыжык са шчаслівымі марамі пра светлую, лепшую будучыню. Ды хто ж ведаў, якія спакусы ў той будучыні ўжо чакалі нас, як чакае здабычу хітры драпежнік, стаіўшыся ў зараслях. А яны ж чакалі нас, гатовыя накінуцца на даверлівых вясковых прастачкоў.



“Здымак ля роднай хаты. Я пакінуў яе, пайшоў у людзі ў 1967 годзе. Ужо няма на свеце бацькоў, брата. І мне часам вельмі балюча, калі здаецца: здрадзіў я тады хаце, у якой вырас. У 2017-м у канцы жніўня ў яе заходзіў. Там жыве мая равесніца: разам у школу хадзілі. То на душы паспакайнела, бо хата – не пакінута, з гаспадарамі”.

У школе, помню, вучылі нас у першую чаргу — атэізму. Хаця паўсюль вакол нас былі абразы, былі вернікі. То мы верылі — і не верылі, бо шмат чаго не разумелі. Усё змяшалася ў вясковым свеце з новымі парадкамі-павевамі. Да народных, прадаўніх стараславянскіх і хрысціянскіх святаў дадаліся — савецкія. Новае і старое часта супярэчыла адно другому. Таму ў школе было для нас адно жыццё, дома — другое, а на сяле — ужо нашынскае, дзіцячае. Нашы гульні былі, вядома ж, больш ваенныя. Хаця, помню, было вельмі няпроста дзяліцца на сваіх і чужых. Мы знаходзілі ў лясах зямлянкі, бліндажы, нямала розных ваенных рэчаў, у тым ліку й смяротна небяспечных. Але ж — Бог літасцівы, і ў школе нас добра вучылі.

Што найбольш яднала людзей у цяжкім ваенным ліхалецці? Народ і дзяржава, хоць яны й спрадвечныя антыподы, як тыя перакладзіны крыжа, у цяжкую для іх пару, аказаўшыся ў пастцы адной вялікай бяды, стойка разам неслі свой адзіны крыж. Перакрэсце крыжа было тым месцам, дзе ядналіся іх надзеі, справы. Цяпер жа для мяне крыж ёсць сімвал планетарнай канструкцыі: зямнога прастору й нашай бытнасці на зямлі. Мы, вядома ж, прывязаны да гэтай “канструкцыі” жыццёвай пупавінай. Крыж — паяднанне вертыкалі й гарызанталі, як зямных арыенціраў. Мы не можам жыць інакш, як “на крыжы”, бо такі наш фізічны лёс. Вертыкаль — галоўны арыенцір, азначае кірунак руху ўверх (узыходжанне) ці то ўніз (сыходжанне). Падаецца мне, ніякія іншыя ўмоўнасці не адолеюць прыродныя інстынкты жыццёвага выяўлення. Але — каму ўверх, а каму ўніз? Вечнае пытанне. Кажуць нават, што ў жыцці многае прадвызначана, ды, хочацца верыць, што й мы сваім разуменнем, характарам, дзейнасцю (ці бяздзейнасцю...) нешта можам выяўляць, карэктаваць у сваім лёсе. Гарызанталь крыжа, як і лінія гарызонту, дзеліць нашу сутнасць на дзве часткі. Верхняя частка, мяркую, сімвалізуе ўсё нябеснае, узвышанае ў нас, у тым ліку й галаўны мозг з інтэлектам, а ніжняя ад гарызонту частка — зямное.

Такія мае думкі на гэты конт. Зрэшты, у розных аўтараў, філасофскіх школах, рэлігіях па-рознаму прачытваецца сімволіка крыжа. Мне ж блізкае меркаванне, што тыя нашы арыенціры на зямлі — гэта й сімвалічныя вектары напрамкаў развіцця духоўнай, фізічнай, біялагічнай сфераў нашага быцця. Так што, пэўна, зусім не выпадкова крыж — галоўны сімвал розных рэлігій. Я ж не сумняваюся: усё, што я змог зрабіць і выявіць у сваім жыцці — гэта “разгортка ў часе й прасторы” таго імгнення, калі я, ад нараджэння, атрымаў свой крыж. Які нясу па жыцці й па гэты час.

Уладзімір Банцэвіч

ЖЫВАЯ ПАМЯЦЬ

Да Паэта — з чырвонымі ружамі

24 снежня ў Мінску ўшанавалі памяць вялікага сына беларускай зямлі Адама Міцкевіча

"Калядкі ля помніка Адаму Міцкевічу" — назвалі сустрэчу ў скверы, які носіць імя паэта, дзяржаўныя і культурныя дзеячы, польскія дыпламаты, прадстаўнікі польскай дыяспары ў Беларусі, каталіцкія вернікі. Традыцыя маліцца за земляка, спяваць песні й чытаць яго вершы ўзнікла ў 2003 годзе, калі ў Мінску па ініцыятыве польскай дыяспары быў усталяваны бронзавы помнік беларускаму й польскаму паэту — гэта на Гарадскім Вале, непадалёк ад скрыжавання вуліц Няміга й Раманаўская Слабада.

Святой імшой у касцёле святых Сымона і Алены (Чырвоным касцёле) распачалося ўшанаванне выбітнога беларуса. Пасля літургіі працэсія на чале з пробашчам ксяндзом Уладзіславам Завальнюком з ружамі ў руках і каляднымі спевамі рушыла да помніка Паэту. На імпрэзе каталікі дзяліліся з усімі аплаткамі, пасвенчаным хлебам. Святар перакананы: калі чалавека сустракаюць з хлебам, ён можа спадзявацца, што там — яго браты й сёстры. Гучалі святочныя спевы, якія неслі радасць і супакой у сэрцы, вернікі віншавалі прысутных з надыходзячым святам нараджэння Езуса.

Будучы паэт, як вядома, нарадзіўся ў вілігійны вечар 24 снежня, напярэдадні свята Божага нараджэння, у 1798 годзе ў фальварку Завоссе Наваградскага павета (цяпер Баранавіцкі раён). Быў ахрышчаны 2 лютага 1799 года ў наваградскім фарным касцёле Перамянення Пана, дзе ёсць цудатворны абраз Маці Божай Наваградскай, і з'яўляўся каталіком. Таму беларускія каталікі не без гонару ў гэты дзень пыталіся: "Ці ж не цуд учыніў Бог, калі падарыў свету вялікі талент Адама Міцкевіча?"

CHYRVONY.BY

Кветкі і лампадкі ля помніка Адаму Міцкевічу. Мінск, 24 снежня 2018 г.

А напярэдадні святкавання 220-гадовага юбілею паэта яго цяперашнія землякі з Навагрудка па запрашэнні парафіі святых Сымона і Алены 16 снежня гасцявалі ў Мінску, паўдзельнічалі ў вечарыне "Адамаў шлях пад вечным небам". Гэта былі гурткоўцы, што вывучаюць польскую мову й культуру пры касцёле святога Міхала Арханёла — гуртку два гады, створаны ён па ініцыятыве пробашча ксяндза Юрыя Жэгарына. Выступоўцы зрабілі спектакль па матывах твораў Адама Міцкевіча "Дзень добры", баладаў "Свіцязь" і "Вяртанне таты". На польскай мове быў пастаўлены спектакль-мініяцюра "Powrot taty". Напрыканцы гурткоўцы чыталі па ролях баладу Міцкевіча "Люблю я" на беларускай, рускай ды польскай мовах. Сюжэт разварочваецца ў родных для паэта мясцінах: Наваградчына, ля вёскі Рутка.

Вядомы пісьменнік, дзяржаўны дзеяч Анатоль Бутэвіч упэўнены: такія Калядныя спатканні вельмі патрэбныя. Ён звярнуў увагу прыхільнікаў творчасці паэта на высілкі пробашча Чырвонага касцёла ксяндза Уладзіслава Завальнюка, дзякуючы якому ўсталявалася традыцыя штогод сустракацца ля помніка Адаму Міцкевічу. Анатоль Іванавіч расказаў, як, працуючы над сваёй кніжкай пра гісторыю Мірскага замка, зразумеў: менавіта ж ён апісаны ў знакамітым творы Адама Міцкевіча "Пан Тадэвуш". А пісалася паэма ў Парыжы. Паэт думаў пра родныя мясціны й далёка ад Радзімы.

Жыць далёка ад роднага краю, быць выгнаннікам прыйшлося Адаму, вядома ж, не па сваёй волі. Інтэрнэт падказвае: у кастрычніку 1824-га па раздзьмутай "Справе філаматаў" (гурток патрыятычнай моладзі) ён быў высланы з тэрыторыі Літвы, у склад якой тады ўваходзіў і Наваградак. У выгнанні паэт жыў у Санкт-Пецярбурзе, Адэсе, Еўпаторыі, Сцяблёва, Харкаве, Маскве. У маі 1829-га ён выехаў з Санкт-Пецярбурга за мяжу, і жыў тады ў Германіі, Швейцарыі, Італіі ды Францыі. Дрэздэн, Парыж, Лазана — гарады, дзе ў эміграцыі Адам Міцкевіч займаўся публіцыстыкай, чытаў лекцыі: да 1840 года выкладаў антычную літаратуру ў Лазане, затым стаў прафесарам кафедры славянскіх літаратур у Калеж дэ Франс. Памёр ён у Стамбуле, куды паехаў у 1855 годзе. У 1890-м прах Міцкевіча быў перавезены з Парыжа ў Кракаў і перазахаваны ў саркафагу ў Вавельскім кафедральным саборы.

У Польшчы Адам Міцкевіч лічыцца адным з трох вялікіх паэтаў эпохі рамантызму: побач з Юліушам Славацкім і Зыгмунтам Красінскім. Сёння відавочна, што й на беларускую літаратуру XIX стагоддзя ён таксама аказаў вялікі ўплыў.

Выступоўцы ля помніка Адаму Міцкевічу гаварылі, што ў нашы дні варта думаць не пра тое, да якой нацыянальнасці аднесці песняра беларускай зямлі, а пра тое, што ён зрабіў на карысць роднага краю.

Ганна Лагун

ПОВЯЗЬ ЧАСОЎ

Лірычнае рэха "Крымскіх санетаў"

Беларусы Еўпаторыі ўшанавалі памяць пра Адама Міцкевіча, які бываў у старажытным горадзе ў 1825 годзе

Актывісты мясцовай Беларускай нацыянальна-культурнай аўтаноміі "Крым — Беларусь" 24 снежня ўшанавалі памяць пра

Ансамбль "Чиполлино" з Мазыра на вуліцах Еўпаторыі

Адама Міцкевіча. Спачатку мы ўсклалі кветкі да мемарыяльнай дошкі, што на доме па вул. Караімскай, 53. Дошка нагадвае: у 1825 годзе вялікі паэт быў у нашым горадзе. Затым у бібліятэцы імя Лесі Украінкі мы правялі імпрэзу, прысвечаную 220-м угодкам паэта. Глядзелі фільм на беларускай мове "Нарадзіўся я літвінам" (Белвідэацэнтр, 2006), дзе ёсць аповед і пра Адама Міцкевіча, па-беларуску гучалі й вершы паэта.

Варта яшчэ нагадаць: у сяброў суполкі цяпер ёсць традыцыя: праводзіць гасцей з Беларусі (як творчыя гурты, так і асобных) па турмаршруце "Малы Ерусалім" і ля дома №53 на Караімскай распавядаць пра жыццё і творчасць нашага земляка Адама Міцкевіча. Летась я запрашала ў Еўпаторыю пагасцяваць узорны вакальны гурт "Чиполлино" з Мазыра (Гомельская вобласць), якім кіруе Клаўдзія Пуш. Дарэчы, і я ж — таксама родам з Гомельшчыны. Гэты калектыў — лаўрэат і дыпламант міжнародных конкурсаў і фэстаў. Правяла для гасцей экскурсію па горадзе, расказала пра Адама Міцкевіча. Вядома ж, у юных беларускіх сяброў быў выдатны настрой, весела блішчалі вочы — і я прапанавала ім паспяваць беларускія песні. Адгукнуліся, дружна ўступілі ў шматгалосы хор. Праспявалі адну песню, потым яшчэ. Гэта было так здорава! Бо песні ж гучалі вельмі зладжана, да таго ж — беларускія народныя. Такі лірычны экспромт, мяркую, ацаніў бы й сам Адам Міцкевіч! А ў нашым часе сабраліся вакол гледачы: слухалі ў захапленні, прытанцоўвалі, апладзіравалі.

Адам Міцкевіч, як вядома, нарадзіўся паблізу Наваградка, быў ахрышчаны, дзіцячыя гады правёў у тым горадзе. Пісаў творы — на польскай мове, аднак знакамітая паэма "Пан Тадэвуш" пачынаецца словамі "O Litwo! Ojczyzno moja...", што ў перакладзе азначае: "О, Літва! Мая Айчына..." І мы ж ведаем: Літвою ў той час называлася якраз гістарычная частка Беларусі — тэрыторыі пад Наваградкам. У 1824-м распачынаўся ягоны шлях выгнанніка. У 1825-м паэт наведаў паўвостраў Крым. У Еўпаторыі агледзеў караімскія кенасы, дзе гутарыў са старэйшым газзанам Іосіфам-Саламонам Луцкім. (Кенаса — малітоўны дом караімаў ва Усходняй Еўропе. Кенасамі называюць і караімскія храмы ў Еўпаторыі. А караімамі на сярэднявечным усходзе называлі цюрак і крымскіх візантыйцаў, якія вырашылі вызнаваць юдаізм. Газзан — караімскі святар, які праводзіць набажэнствы ў кенасе. — **Рэд.**)

Гасцяваў паэт і ў доме еўпатарыйскага гарадскога галавы й кіраўніка крымскіх караімаў Хаджы-ага Бабовіча — якраз на тым доме і ўстаноўлена мемарыяльная дошка. Для гасцей з Мазыра прачытала я на беларускай мове санет "Выгляд гор са стэпаў Казлова" Адама Міцкевіча — ён пяты ў цыкле, напісаны пасля наведвання Еўпаторыі. (Гэты санет у перакладзе Уладзіміра Мархеля друкаваў часопіс "Наша Вера" (№4, 2008), ёсць у інтэрнэце: http://media.catholic.by/nv/n46/art13.htm — **Рэд.**) Распавяла пра знаходжанне паэта ў Крыме, міцкевічавы "Крымскія санеты": гэта 18 лірычных вершаў. Вось так паэзія Адама Міцкевіча, беларускія песні ды нашы сяброўскія стасункі з землякамі-мазыранамі й перакінулі масток дружбы паміж народамі. А сярод удзельнікаў імправізаванага канцэрту былі беларусы, украінцы, рускія, крымскія татары.

Цяпер я рыхтую новы нумар часопіса, які раскажа пра жыццё, дзейнасць беларусаў, якія ў розныя гады гасцявалі й жылі ў Крыме, пра іх творчасці. Мяркую адкрыць нумар публікацыяй пра вялікага сына беларускай зямлі, класіка сусветнай літаратуры Адама Міцкевіча, якога ўшаноўваюць і беларусы Крыма, горада Еўпаторыя.

І яшчэ трохі — пра повязь часоў. У суполцы "Крым — Беларусь" зберагаецца ксеракопія каштоўнай кнігі "Крымъ въ русской поэзіи. Сборникъ стихотвореній". Зборнік склаў вялікі беларус Арсень Маркевіч, які жыў і працаваў у Крыме, кніга выйшла ў Сімферопалі ў 1897 годзе. У прадмове да зборніка ўкладальнік пісаў: "Усім, каму мілая прырода Крыма, каму дорага яго мінулае, прысвячаецца гэты зборнік". Ён выбраў лепшыя вершы, на якія творцаў натхніла цудоўная прырода Таўрыды, яе жыццё ды лёсы з мінулага. Якраз там у раздзеле другім пад назвай "Горы, долины и степи" надрукаваны лірычны верш Адама Міцкевіча "Видъ горъ изъ степей Козлова" ў перакладзе Міхаіла Лермантава. "Стэпы Казлова" — так раней называліся Еўпатарыйскія ваколіцы.

Пад час ускладання кветак

Кветкі памяці ў Еўпаторыі

У нашай суполцы ёсць і кніга "Адам Міцкевіч. Выбраныя творы" ("Беларускі кнігазбор", 2003), дзе змешчаны гэты ж верш, перастворaны Максімам Танкам. І якраз гэты тэкст пабеларуску я й чытала 24 снежня ля мемарыяльнай дошкі ў гонар Адама Міцкевіча ў Еўпаторыі.

Дзіна Шаўчэнка,
старшыня праўлення
Беларускай нацыянальна-культурнай аўтаноміі
"Крым – Беларусь"

БЕЛАРУСКАЯ ДУША

Іван ды Марыя з Азершчыны

Вясковая сям'я Гапоненкаў, што жыве ў Рэчыцкім раёне, справіла дыяментавае вяселле

Святочнае віншаванне сямейнай пары з дыяментавым вяселлем

У кожнага паселішча беларускага ёсць свой характар, свой нораў і запал. І ў вёсцы Азершчыне, што багатая на рэчку, лес, азёры, ёсць сваё эмацыйнае жыццё. Прыгожы куток у нашым раёне Гомельшчыны, і людзі тут — працавітыя, з адкрытымі душамі, добрымі сэрцамі. Звязалі свой лёс з Азершчынай, з людзьмі, якія сталі аднавяскоўцамі, Іван ды Марыя Гапоненкі. Прыгледзьцеся ў твары мужа і жонкі: як яны падобныя і якія прыгожыя! Нібыта гады іх упрыгожваюць. Яны стварылі сям'ю 60 гадоў таму, і святкавалі летась разам з роднымі, блізкімі сваё дыяментавае вяселле.

Марыя Іванаўна родам з вёскі Баравікі: раней то быў Парыцкі раён, Бабруйскай вобласці, цяпер — Светлагорскі раён Гомельшчыны. З сялянскай сям'і. Як і ўсе вяскоўцы, з дзяцінства — у працы. Ад маці, родных пераняла шмат традыцый і абрадаў, з гадамі сама стала іх захавальніцай. Выдатна вышывае, шые, вяжа. У Цэнтры культуры й вольнага часу вёскі Азершчыны ладзіліся выставы яе прац: "З крыніцы народнай", "Ад вытокаў да сучаснасці", "Жыватворныя вытокі" ды іншыя. Сустрэнеш яе працы й на гарадскіх імпрэзах, выставах, на абласных святах, Дажынках. І ў працы, і ў творчасці дапамагаюць спадарыні Марыі народныя песні, яны ж падтрымліваюць заўсёды, нават калі бывае нясцерпна цяжка.

Расказвала: у маленстве адным з найвялікіх жаданняў Машы было — вырасці. Але пачалася вайна. Марыя памятае ўсе жахі фашысцкай акупацыі: як голадам людзей марылі, як зганялі ў Нямеччыну. І як маці ратавала дзяцей, хаваючы іх у склепе й падполлі, а потым не стрымлівала слёз радасці, калі прыйшло вызваленне. Таму цяпер Марыя лічыць: самая вялікая радасць для чалавека — жыць пад мірным небам, працаваць, бачыць шчаслівыя ўсмешкі блізкіх, родных. Пасля вайны дзяўчына пайшла ў школу пераросткам, потым, у 50-я, падлеткам, з'ехала ў горад Шчучын да родзічаў: дзяцей даглядаць. Дзядзька яе працаваў рэдактарам раённай газеты, цётка выкладала ў тэхнікуме. Там дзяўчына закончыла вячэрнюю школу. Далей — праца на Рэчыцкай ткацкай фабрыцы, у Светлагорску — на будоўлі. Але менавіта ў родных Баравіках яна сустрэла Івана Гапоненку. Ён пяць гадоў адслужыў у войску, у Севераморску Мурманскай вобласці, потым закончыў Рэчыцкую школу механізацыі. Уладкаваўся памочнікам машыніста на меліярацыйную станцыю — і таксама прыехаў у Баравікі. Там і сустрэліся, пакахалі адзін аднаго. Марыя прызнаецца: падкупіла яе высакароднасць, выхаванасць і дабрыня Івана. У хуткім часе, 6 кастрычніка 1958 года, згулялі вяселле, атрымаўшы ад жыцця каштоўны падарунак: вялікае каханне.

Сёння для іх найдаражэй за ўсё — дзеці: сын Павел, дочкі Ала, Людміла, Валянціна. Цяпер яшчэ й чатыры ўнукі ды праўнучка Амелія. Трое дзяцей з сем'ямі жывуць у Таліне, Валянціна — у Рэчыцы. Усе яны вельмі дружныя й працавітыя: у вёсцы ж усё навідавоку, і людзі ведаюць, хто чаго варты. Суседзі кажуць, што дзеці Гапоненкаў пабралі ўсе лепшыя якасці ад маці й бацькі. З маленства дапамагалі весці гаспадарку: нарыхтоўвалі сена, дровы, умелі даіць карову, трымалі курэй, качак, гусей. У нядзелю ў хаце было свята: на стале святочныя стравы, прысмакі. Адпачынак у іх сям'і быў прадуманым і зладжаным. І па жыцці бацькі навучылі дзяцей таму, што ведалі самі з вуснай народнай творчасці, традыцый, абрадаў.

Іван ды Марыя Гапоненкі на пасяджэнні клуба "Жывіца"

Жывучы ў Таліне, Ала, Павел і Людміла шануюць беларускія абрады, а каларыт хатніх святаў і сямейных традыцый перадаюць сваім дзецям і ўнукам. Штогод дзеці едуць да бацькоў, у Азершчыну. Бацькі — пенсіянеры: Марыя Іванаўна адпрацавала 26 гадоў, а Іван Паўлавіч — 40 гадоў у ПМК-73. Летась была яшчэ адна важная падзея ў родзе Гапоненкаў: у Дзень Перамогі нашчадкі ўдзельніка Вялікай Айчыннай вайны Паўла Іванавіча Гапоненкі пабывалі у Расіі, усклалі кветкі на яго магілу. Гэта бацька Івана Паўлавіча. Родам ён з вёскі Вятхінь, працаваў у Рэчыцкім вайсковым камісарыяце. Як пачалася вайна, сышоў на фронт. Аднавяскоўцы памятаюць словы малодшага лейтэнанта Гапоненкі: "Мы вернемся...". Потым прыйшла пахаронка... Ведалі, што ён загінуў, пахаваны недзе пад Ленінградам. Дзеці Івана настойліва шукалі магілу дзеда, аб'ездзілі ўсю Наўгародскую вобласць, чыталі прозвішчы на многіх абеліскі і брацкіх магілах. І, нарэшце, знайшлі на адной імя дзеда: у вёсцы Кузьмінка, дзе пахавана каля 330 савецкіх салдат. 9 мая 2018 года ўнукі і праўнукі пабывалі на магіле дзеда Паўла Іванавіча і ўшанавалі яго памяць. У год 75-годдзя вызвалення Рэчыцы і Рэчыцкага раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў дарога памяці прывяла яго нашчадкаў з Прыбалтыкі праз Ноўгарад на родную Рэчыцкую зямлю, дзе заўсёды іх чакаюць дзядуля і бабуля — Іван ды Марыя.

Жыццё гэтых прыгожых вясковых людзей па-ранейшаму напоўнена сэнсам, яно суладнае, гарманічнае. Іван ды Марыя застаюцца жыццялюбамі, працавітымі, закаханымі кожны ў сваю палавіну. І жыццёвым досведам, шмат перажыўшы ды перадумаўшы, падзяліцца могуць, іншым нешта каштоўнае падказаць. Ніводнае пасяджэнне клубаў "Жывіца" і "Сям'я", што былі створаны 25 гадоў таму ў Азершчынскім Цэнтры культуры й вольнага часу, не абыходзіцца без удзелу гэтай пары. Тут лічаць іх старэйшынамі аб'яднання, ганаровымі яго ўдзельнікамі. Мае старэйшыя сябры стаялі ля вытокаў клуба, іхні жыццёвы досвед іншым сем'ям дапамагае ўмацавацца, прайсці праз усе выпрабаванні — з гонарам.

Людміла Грызунова,
мастацкая кіраўніца Рэчыцкага гарадскога палаца культуры

РОДНЫЯ ЛЮДЗІ

Успамін у лазовым кошыку

Пад Навагодняй ёлкай у крымскім горадзе Еўпаторыя ёсць і дэкаратыўны твор з Беларусі

У нашым Еўпатарыйскім краязнаўчым музеі 7 студзеня прайшла цёплая сустрэча з прадстаўнікамі нацыянальна-культурных аўтаномій "Рождественские праздники и обряды народов Крыма". Старшыня суполкі "Крым — Беларусь" Дзіна Шаўчэнка была на імпрэзе ў ролі цёткі Шчодры з беларускага Каляднага фальклору. Віншавала ўсіх з зімовымі Святкамі, частавала прысмакамі, распавяла пра зімовыя беларускія традыцыі, абрады — Каляды, калядоўшчыкаў, што такое Куцця ды Звязда (з якою ходзяць калядоўшчыкі). Шчодра знаёміла ўсіх з працамі беларускіх майстроў народнай творчасці, што прывезла з Беларусі. А музею падарыла, паставіўшы пад ёлачку, дэкаратыўны кошык з беларускай лазы.

Дз. Шаўчэнка ў ролі Шчодры

Але як ён у яе аказаўся? "Яшчэ ў 2007-м як галоўны рэдактар часопіса "Крым — Беларусь" я ўдзельнічала ў Міжнароднай спецыялізаванай выставе "СМІ ў Беларусі" ў Мінску, — расказала Дзіна Шаўчэнка. — З групай журналістаў наведалі выставу, што ладзіў Беларускі саюз народнай творчасці. Мы патрапілі ў цудоўны свет народнага мастацтва, экскурсію правяла Тамара Харланчук. Мяне ўразіла вялікая разнастайнасць вырабаў: аплікацыя саломкай, пляценне з прыродных матэрыялаў, мастацкая апрацоўка дрэва, ткацтва, ганчарства, карункапляценне, вышыўка, традыцыйныя лялькі... Гэта самабытны мастацкі свет. А паколькі мы ў Еўпаторыі пашыраем веды пра беларускую культуру, то я палічыла: варта нешта купіць! Вось і набыла некаторыя творы майстроў народнай творчасці. А БСНТ, арганізатарам выставы падарыла свой часопіс, прысвечаны Еўпаторыі".

Вырабы народных майстроў

Дзіна Шаўчэнка перакананая: працы майстроў народнай творчасці — каштоўны складнік багатай культуры беларусаў. Такія творы звязваюць пакаленні беларусаў, якія жывуць і за межамі Бацькаўшчыны.

Зінаіда Здараўцова,
г. Еўпаторыя

А ЯК У ВАС?

Цярэшка ў Іркуцку

Беларусы ў Сібіры выкарыстоўваюць каштоўны досвед супольнага жыцця продкаў, каб прыўнесці ў зімовыя вечары беларускі каларыт

У чарговы раз у нашай пошце — абвестка пра тое, што ў сібірскім Іркуцку 29 снежня ў Доме афіцэраў ладзіліся Калядныя вячоркі: адметная, каларытная "Жаніцьба Цярэшкі". "Іркуцк — шматнацыянальны горад: перамяшаліся ў ім традыцыі розных народаў, — піша ў рэдакцыю Алег Рудакоў. — Але ж тым і багатая наша супольная Іркуцкая культура. І ёсць у ёй беларуская традыцыя — "Жаніцьба Цярэшкі". Гэтую дзею ладзіць наш Іркуцкі Беларускі клуб "Крывічы" не першы раз — і заўсёды з поспехам".

Алег нагадвае: у ЖЦ злучаныя шматлікія кірункі народнай творчасці: музыка, танец, песні, гульні, жарты, прадстаўленне... Прычым у кожнага ёсць магчымасць неяк праявіць сябе, раўнапраўна паўдзельнічаць у забаве. ЖЦ — старадаўні беларускі абрад, пад час якога ў жартаўлівай форме ладзіцца "сватаўство" ды "жаніцьба" юнакоў і дзяўчат, мужчын і жанчын: "Пад час свята гучыць шмат жартаў, беларускіх народных Калядных песень. Мы водзім карагоды, танцуем і здорава праводзім час". І што важна: гэта ж якраз тое, што цяпер называюць модным словам інтэрактыў. Бо на "Жаніцьбе Цярэшкі" няма гледачоў — усе, ад малога да вялікага, уключаюцца ў гульнявую, трохі тэатралізаваную дзею.

Раней абрад пашыраны быў там, дзе жыло племя крывічаў: ён быў абавязковым у Калядным цыкле святаў. Заслугоўвае павагі, што беларусы Іркуцка яго зберагаюць, адаптаваўшы да ўмоваў горада.

Рыгор Гарэшка

Чытайце газету ў інтэрнэце на партале zviazda.by
Падпісацца на газету "Голас Радзімы" можна ў паштовых аддзяленнях Беларусі
Заснавальнік: Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Выдавецкі дом «Звязда»"
Галоўны рэдактар Іван ЖДАНОВІЧ
Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а. Пакой 907.
E-mail: golas_radzimy@tut.by
Тэлефон: + 375-17-287-19-19
Рэдакцыйнае пасведчанне №61. Выдадзена 16.07.2018 года Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь
Выдавец: Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Выдавецкі дом «Звязда»". Дырэктар – галоўны рэдактар Павел Якаўлевіч СУХАРУКАЎ
Аб'ём выдання: 2 друк. арк.
Падпісана да друку: 14.01.2019 г.
Наклад
Заказ –
Выходзіць 2 разы на месяц
Месца друкавання: Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "БудМедыяПраект". ЛП №02330/71 ад 23.01.2014. Вул. Веры Харужай, 13/61. 220123 Мінск, Рэспубліка Беларусь
© "Голас Радзімы", 2019
Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе, не вяртаюцца і не рэцэнзуюцца. Пазіцыя рэдакцыі ды аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках "Голасу Радзімы", могуць не супадаць